# ПОДЗВІГ НАРОДА НЕ ЗГАСНЕ Ў ВЯКАХ!

★ ★

**НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКАЯ ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА САВЕЦКАГА САЮЗА—ПАЛІТЫКА МІРУ І ДРУЖБЫ НАРОДАЎ, ЗГУРТАВАННЯ ЎСІХ СІЛ, ЯКІЯ ЗМАГАЮЦЦА СУПРАЦЬ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ, РЭАКЦЫІ І ВАЙНЫ!**

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 16(112) | Субота, 6 мая 1972 г. | Год выдання 3-ці | Цана 2 кап.



## У ПАМЯЦІ ЧАЛАВЕЦТВА

У памяці чалавецтва назаўсёды застанецца той светлы майскі дзень 1945 года, калі над нашай неабсяжнай Радзімай, над усім светам з хуткасцю маланкі пранеслася вестка аб перамоганосным заканчэнні вайны ў Еўропе, аб поўным разгроме фашысцкай Германіі. Вайна закончылася там, адкуль яна прыйшла. Наступіў доўгачаканы Дзень Перамогі. Гэты дзень — 9 мая стаў для нас вялікім і радасным святам, святам бязмежнай гордасці за нашу вялікую краіну і яе гераічны народ.

Перамога Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне гістарычна абумоўленая, заканамерная. У гіганцкім ваенным сутыкненні з самым агалцелым атрадам сусветнага імперыялізму — германскім фашызмам перамог сацыялістычны грамадскі і дзяржаўны лад, перамагла марксісцка-ленінская ідэалогія. Былі пераканаўча прадэманстраваны высокія маральныя якасці савецкага чалавека, яго бязмежная адданасць ідэалам камунізму, яго палымяны патрыятызм, які непарыўна звязан з пралетарскім інтэрнацыяналізмам.

«Вайна, — гаварыў У. І. Ленін, — ёсць выпрабаванне ўсіх эканамічных і арганізацыйных сіл кожнай нацыі» (Поўны збор Твораў, т. 39, стар. 321). Як паказала гісторыя, Савецкая дзяржава, якая прадэманстравала сваю вялікую перавагу над капіталізмам у гады мірнага сацыялістычнага будаўніцтва, з'явілася лепшай формай мабілізацыі ўсіх сіл народа і ў час вайны.

Савецкі народ атрымаў рашучую перамогу ў гэтай самай буйной і жорсткай у гісторыі чалавецтва вайне таму, што вялікім правадыром, мудрым стратэгам і арганізатарам барацьбы была ленінская партыя, партыя патрыётаў і інтэрнацыяналістаў. Яна правільна вызначыла характар вайны, мэты і задачы нашага народа і яго арміі ў барацьбе з агрэсарам, умела выкарыстала ў інтарэсах перамогі невычарпальныя магчымасці, закладзеныя ў сацыялістычным ладзе, у ваеннай арганізацыі Савецкай дзяржавы. Камуністычная партыя аб'яднала, згуртавала ўадзіна гіганцкія намаганні фронту і тыла, воінаў і працаўнікоў, усіх народаў СССР у імя дасягнення перамогі. Кіруючыся ленінскім вучэннем аб абароне сацыялістычнай Айчыны, партыя змагла мабілізаваць усе матэрыяльныя і духоўныя сілы савецкага народа на разгром ворага. Абапіраючыся на маральна-палітычнае адзінства савецкага грамадства і дружбу народаў, партыя ператварыла ўсю краіну ў адзіны баявы лагер.

(Заканчэнне на 3 стар).

## 5 МАЯ—ДЗЕНЬ ДРУКУ

Кожны год 5 мая савецкія людзі адзначаюць Дзень друку, устаноўлены ў азнаменаванне выхаду першага нумару аснаванай У. І. Леніным бальшавіцкай газеты «Правда». Уся яе гісторыя непарыўна звязана з гераічным летапісам Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Галоўнейшыя прынцыпы партыйнасці і народнасці, абвешчаныя У. І. Леніным, так жа святыя і непарушныя для прэсы 70-х гадоў.

У святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС, якія з'яўляюцца асковай практычнай работы дзеячоў ідэалагічнага фронту, арганізатарская і прапагандысцкая сіла страснага партыйнага слова асабліва ўзрастае. Абавязак савецкіх журналістаў — несці сотням мільёнам людзей праўду аб сацыялістычным грамадстве, аб савецкім вобразе жыцця. Яны заклікаены несці ў масы, распаўсюджваць усёперамагаючыя ідэі марксісцка-ленінскага вучэння, садзейнічаць глыбокай эканамічнай адукацыі працоўных, выхаванню іх у духу камуністычнай перакананасці, патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму, непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі і перажыткаў мінулага.

У нашым універсітэце друку ўдзяляецца паўсядзённая ўвага. Усе студэнты з'яўляюцца актыўнымі падпісчыкамі газет і часопісаў. У нас выдаецца шматтыражная газета «Гомельскі універсітэт», на кожным факультэце ёсць свая насценная газета. Акрамя таго, выпускаецца шмат бюлетэней і дадаткаў.

(Заканчэнне на 4 стар.)

⊙

У нашым універсітэце працуюць многія ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Яны ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза. І сёння ветэраны ў страі — працуюць на адказных участках.

**На здымку:** удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны (у ніжнім радзе, злева направа) І. А. Ільіных, Д. А. Ляпончанка, Ф. М. Стрыкакоў, Г. С. Мільчанка, П. А. Савіцкі, А. А. Баскакаў, (у верхнім радзе) В. В. Юферaў, І. Б. Кудравіцкі, Г. П. Мялёхін, У. В. Анічэнка, І. У. Жукаў, У. С. Сідараў, С. Еўдакіменка, М. М. ...рынчык, Я. А. Семянчук, Д. Будзько, Ф. Ф. Ганэль, А. І. Браталюбаў.



⊙

# ГДУ РАПАРТУЕ РАДЗІМЕ

Першамай. Светлае свята працы і міру, адзінства і братэрства. Кожны год яно з'яўляецца вялікім аглядам нашых працоўных поспехаў, нашых дасягненняў у розных галінах дзейнасці.

Сёлетні Першамай увесь савецкі народ сустрэў на новых рубяжах камуністычнага будаўніцтва — у абстаноўцы актыўнай барацьбы за ажыццяўленне гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС, у імкненні адзначыць знамянальную падзею — 50-годдзе ўтварэння СССР новымі дасягненнямі ў сацыялістычным спаборніцтве за паспяховае выкананне заданняў другога года пяцігодкі.

Сонечным, святочным і незвычайна ўрачыстым выдаўся ў нашым старажытным горадзе мінулы першамайскі панядзелак.

Яшчэ задоўга да вызначанага часу да універсітэцкіх карпусоў пачалі збірацца студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі ГДУ. З добрым настроем прыйшлі яны да свята. І гэта не дзіўна. Першага мая — дзень нараджэння нашага універсітэта. Сёлета яму споўнілася тры гады. Прайшоўшы з дня адкрыцця ГДУ перыяд быў часам яго станаўлення.

Набліжаецца пачатак ўрачыстага шэсця. З вялікай увагай праслухалі сабраўшыеся выступленне Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Мікалая Віктаравіча Падгорнага на першамайскай дэманстрацыі ў Маскве.

Да дзесяці гадзін раніцы зборы былі закончаны, і хутка амаль трохтысячная калона Гомельскага дзяржаўнага універсітэта рушыла да месца традыцыйных урачыстых шэсцяў і маніфестацый — плошчы імя Уладзіміра Ільіча Леніна.

Уперадзе калоны — сцяг ГДУ. Высокі гонар несці яго даручан праслаўленаму савецкаму спартсмену пераможцу XVII Алімпійскіх гульняў у Рыме, неаднаразоваму чэмпіёну свету, Еўропы і Савецкага Саюза, заслужанаму майстру спорту, старшаму выкладчыку факультэта фізічнага выхавання Леаніду Рыгоравічу Гейштару. У многіх адказных рэгатах і буйных спаборніцтвах ён з гонарам абараняў спартыўныя сцягі нашай Радзімы. А сёння ў моцных руках славутага алімпійца сцяг Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

У святочнай калоне крочаць будучыя фізікі і біёлагі, матэматыкі і эканамісты, філолагі і гісторыкі. Ідзе савецкае юнацтва — шчаслівае, маладое пакаленне сацыялістычнай Айчыны, тыя, каму ў бліжэйшыя гады прадстаіць заняць месцы побач са славутымі вучонымі, камандзірамі вытворчасці, каб дастойна працягваць традыцыі перадавой савецкай навукі і індустрыі.

Бурліць людское мора на вуліцах і плошчах Гомеля. Над святочнымі калонамі палымнеюць Заклікі ЦК КПСС, на шматлікіх транспарантах—рапарты працоўных перамог. Аб сваіх здабытках паведамляюць чыгуначнікі і камбайнабудаўнікі «Гомсельмаша», кандытары камбіната «Спартак» і нафтавікі, швейнікі аб'яднання «Камінтэрн» і абутнікі.

Працоўны Гомель дакладвае Радзіме аб сваіх здзяйсненнях і планах на будучае.

Добрымі паказчыкамі сустрэлі Першамай і студэнты Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Ім уручан пераходны Чырвоны сцяг за першае месца сярод вышэйшых навучальных устаноў Беларусі ў круглагадавой спартакіядзе. ГДУ другі год запар прызнаецца пераможцам агляду-конкурсу спартыўна-масавай работы сярод універсітэтаў Савецкага Саюза. У канцы красавіка ў Харкаве праходзіла чацвёртая Усесаюзная Універсіяда. Вялікая група лепшых спартсменаў і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці стала лаўрэатамі і дыпламантамі вялікага студэнцкага форуму.

Актывізавалася і студэнцкая навуковая дзейнасць. Больш чатырохсот студэнтаў удзельнічалі ва універсітэцкім аглядзе-конкурсе навуковых работ, прысвечаным 50-годдзю ўтварэння СССР. Дыпломамі рэспубліканскага конкурсу па праблемах грамадскіх навук удастоены 42 работы студэнтаў ГДУ.

У дзень свята калектыў універсітэта рапартуе Радзіме, што сёлета наша прамысловасць атрымае першы атрад гомельскіх геолагаў, выхаваных у ГДУ.

Працягваецца ўрачыстае шэсце. Радаснымі ўсмешкамі ззяюць твары людзей, усюды жарты, смех. І калышыцца чырвань сцягоў над калонамі, грыміць медзь аркестраў, лунаюць песні. Вясёлыя радасныя песні аб вольнай працы, аб шчасці і міру, аб свабодным чалавеку, аб Камуністычнай партыі і Радзіме.

Калоны дэманстрантаў адна за другой запаўняюць плошчу імя Леніна. З краю ў край яе нясуцца здравіцы сацыялістычнай Айчыне, Камуністычнай партыі. Кіраўнікі абласных партыйных і савецкіх арганізацый, госці Гомеля цёпла вітаюць людзей навукі, савецкае студэнцтва, апладыруюць юнацтву нашага горада.

Урачыста і радасна адзначылі савецкія людзі свята Першамая.





**НА ЗДЫМКАХ: на плошчу імя Уладзіміра Ільіча Леніна ўступае калона Гомельскага дзяржаўнага універсітэта (уверсе). Праходзяць студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта (у сярэдзіне).**



**На здымках: у калоне біёлага-глебавага факультэта (злева). Будучыя спецыялісты фізічнага выхавання.**



